Сямейная газета
Выпуск № 10 (53)



# ДЗІЎНЫЯ ЛЮДЗІ

У роднага брата каляжанкі нарадзілася дачушка. «Я стала цётачкай! — радуецца тая. — На гэтым тыдні паедзе забіраць жонку з радзільні. Запыталася, як будзе сустракаць? «Лімузін па-любому, — кажа ён. — Яшчэ кветкі. Ужо працэнтаў 70 для сустрэчы ёсць. Звярнуся ў святочнае агенцтва, мо, нешта прапануюць? А ты што параіш? Надзя хацела, каб усё было прыгожа...» Я параіла саксафаніста і ў лімузін шары з геліем».

«Лімузін, шары...Навошта? — здзіўляецца старэйшая знаёмая, маці трох дзетак. — Вельмі шмат стала ў нашым свеце вонкавага — на публіку... Нараджэнне дзіцяці — гэта нешта вельмі сямейнае, вельмі глыбокае, патаемнае. Тое, што павінна быць толькі для іх: жанчыны, якая нарадзіла, мужчыны, які стаў бацькам, і немаўляці, што толькі некалькі дзён на гэтым свеце, і якому, канешне, няма да ўсяго гэтага справы. Мне падаецца, што за прыгожай карцінкай можа нейкі важны змест згубіцца».

«Дарослыя вельмі любяць лічбы. Калі вы расказваеце ім пра свайго новага сябра, іх ніколі не цікавіць самае галоўнае. Яны ніколі не спытаюць: «Які ў яго голас? Якія гульні ён любіць? Ці збірае ён калекцыю матылькоў?» Яны пытаюць: «А колькі яму гадоў? Колькі ў яго братоў? Колькі ён важыць? Колькі зарабляе яго бацька?» І толькі тады ім будзе здавацца, што яны ведаюць яго...

Калі вы скажаце дарослым: «Бачыў я адзін прыгожы дом з чырвонай цэглы, з геранню на вокнах, з галубамі на даху... Яны ніяк не змогуць уявіць, што гэта за дом. Ім трэба сказаць: «Бачыў я дом, які каштуе сто тысяч франкаў». І тады яны ўсклікнуць: «О, як гэта прыгожа!»

...Я баюся стаць падобным да людзей дарослых, якіх нічога не цікавіць, апрача лічбаў, — уздыхнуў Маленькі прынц. — Бо...

...Гэтыя дарослыя — вельмі дзіўныя людзі... Яны могуць выгадаваць пяць тысяч ружаў у адным садзе... і не знаходзяць таго, чаго шукаюць. А між тым тое, што яны шукаюць, можна знайсці ў адной-адзінай ружы альбо ў адным глытку вады... Але вочы — сляпыя. Трэба шукаць сэрцам. Самае галоўнае схавана ад вока...

...Адны толькі дзеці ведаюць, чаго яны шукаюць. Яны ўсё аддаюць ляльцы, зробленай з анучак, і яна становіцца для іх самай неабходнай. І калі яе адымаюць у іх, дзеці плачуць. Яны шчаслівыя!..»

Калісьці даўно ў адным горадзе жыў мудрэц. Слава пра яго мудрасць разнеслася па ўсёй краіне: людзі здалёк прыходзілі па параду. Але быў у горадзе чалавек, які зайздросціў мудрацу. Прыйшоў ён неяк на луг, злавіў самага прыгожага матылька, схаваў яго паміж далонямі і падумаў: «Вось пайду да мудраца і спытаюся ў яго: які матылёк у мяне ў руках — жывы ці мёртвы? Калі ён скажа — «мёртвы», я адкрыю далоні і матылёк паляціць. Калі ён скажа — «жывы», я сцісну далоні і матылёк памрэ. Вось тады ўсе зразумеюць, хто з нас разумнейшы».

Сказана — зроблена. Зайздроснік прыйшоў да мудраца і пытаецца: «Скажы, о наймудрэйшы, які матылёк у мяне ў руках — жывы ці мёртвы?»

Мудрэц паглядзеў на яго ўважліва і ціха прамовіў:

— Усё ў тваіх руках!

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

■ Тыя, хто побач

# МОЙ ВЕЛІСТРУХЕН З'ЕЛА МОЛЬ,

## або Як смокінг ператварыўся ў сямейны тэатр



Фота Надзеі БУЖАН.

**Некалькі гадоў таму замежная сяброўка даслала мне малюнак пад назвай «Варэнне з зорак». «Знайшла гэтую беларускую мастачку на прасторах інтэрнэту. Здаецца, табе спадабаецца! Ганна Сілівончык!» Сапраўды, я тады з першага погляду ўлюбілася ў яе казачныя, душэўныя карціны. А зусім нядаўна пазнаёмілася з іх стваральніцай. А дакладней, з усёй неверагодна творчай сям'ёй Ганны: мужам Васілём Пешкуном і 13-гадовай дачкой Машай. Размаўляем спачатку дома, на канапе, затым — у машыне па дарозе на выставу Валянціна Губарава.**

*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*

■ Насуперак стэрэатыпам

# ПУЧОК ПЯТРУШКІ ЗАМЕСТ БУКЕТА

## ЭКАТРЭНЕР НЕ РАЗУМЕЕ, НАВОШТА БРАЦЬ КРЭДЫТ НА ВЯСЕЛЛЕ

**Раман САБЛІН да 29 гадоў быў паспяховым піяршчыкам у буйной расійскай кампаніі. Аднак пасля ў яго здарыўся... крызіс сярэдняга ўзросту. Пераасэнсаваўшы сваё жыццё, захапіўся ёгай, перайшоў на раслінную дыету, а праз некаторы час пазнаёміўся з праектам EcoWiki («Экалагічная Вікіпедыя») і стаў экаактывістам. З тых часоў Раман зніжае свой экаслед (плошча Зямлі, якая неабходна аднаму чалавеку для задавальнення сваіх патрэб цягам жыцця. — Аўт.). У кнізе «Зялёны драйвер. Код да экалагічнага жыцця ў горадзе» ён на ўласным прыкладзе патлумачыў, што значыць жыць экалагічна. Сёння першы экатрэнер Расіі матывуе іншых людзей пераходзіць на «зялёны бок» жыцця, «азеляняе» бізнес.**

***— Раман, з чаго пачаўся ваш рух да экалагічнасці?***

— Са збору другаснай сыравіны. У Маскве я даведаўся пра акцыі па асобным зборы смецця і стаў на іх валанцёрыць. Прапанаваў суседзям па кватэры сартаваць адходы і паставіў тры скрынкі: «шкло», «пластык», «папера». Адна з суседак не пагадзілася, нягледзячы на тое, што 10 гадоў пражыла ў Германіі. «Давай дачакаемся, пакуль установяць кантэйнеры ў двары», — казала яна. Аднак я вырашыў сартаваць. Грузіў заплечнік і праз восем прыпынкаў на метро вёз усё гэтае дабро ў парк, дзе стаялі кантэйнеры для розных відаў адходаў. За тыя шэсць гадоў, што я сартую адходы, кантэйнеры ўсё яшчэ не з'явіліся ў кожным расійскім двары. Але ў Маскве і Санкт-Пецярбургу пунктаў прыёму стала нашмат больш, у прыватнасці дзякуючы акцыям «Раздзельны збор» і праекту «Збіратар». Акцыя доўжыцца тры гадзіны, за гэты час людзі раскладваюць смецце па максімальнай колькасці відаў: напрыклад, не проста пластык, а пластык 3-5 відаў. Праект некамерцыйны, гэта цэлы рух неабыякавых людзей, якія запускаюць хвалю па зніжэнні экаследу.



**Зменшыць экаслед вельмі проста: напрыклад, замяніць лямпачкі на энергазберагальныя альбо святлодыёдныя.**

*(Заканчэнне на 7-й стар. «СГ».)*